

# Спадкаемцы традыцый

**Кафедра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў адзначае 30-годдзе. Кераміка, саломапляценне, ткацтва, батык, валянне, выцінанка, разьба па дрэве — да юбілею ў галерэі "Універсітэт культуры" зладзілі выставу "Спадчыннасць".**



Спадчыннасць — адзін з галоўных фактараў эвалюцыі. Гэта ўласцівасць забяспечваць пераемнасць паміж пакаленнямі, здольнасць і магчымасць перадачы інфармацыі ад папярэднікаў наступнікам. У мастацтве пераемнасць забяспечваецца перадачай ведаў у працэсе навучання. Ад пакалення ў пакаленне трансліруецца назапашаны досвед, аднак спадкаемцы ніколі дакладна не паўтараюць сваіх папярэднікаў.

## ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ

Спецыяльнасць "народная творчасць" (спецыялізацыя "народныя рамёствы") упершыню на прасторы СССР была ўведзеная ў 1990-м у Мінскім інстытуце культуры. Кваліфікацыя "мастак народных рамёстваў", якую атрымлівалі яе выпускнікі, прыцягнула ўвагу вялікай колькасці навучэнцаў вучылішчаў мастацкага профілю, каледжаў, ліцэяў, агульнаадукацыйных сярэдніх школ і школ з мастацкім ухілам. Праз два гады пачаўся набор студэнтаў на завочную форму навучання, а ў лютым 1993-га было сфарміравана адпаведнае структурнае падраздзяленне. Паступова на кафедры афоміўся працаздольны калектыў педагогаў, ядро якога ўтварылі навукоўцы і дасведчаныя творцы розных спецыялізацый: мастацкага тэкстылю, керамікі, саломапляцення і выяўленчага мастацтва.

Кафедрай падрыхтавана значная колькасць высокапрафесійных спецыялістаў, якія працуюць на ніве педагагічнай, творчай і навуковай дзейнасці і працягваюць работу па адраджэнні, захаванні, развіцці і трансляцыі традыцыйнага народнага мастацтва ў сацыякультурнай сферы сучаснага грамадства. Галоўная задача педагогаў кафедры — падрыхтоўка маладых спецыялістаў, якія на аснове трывалай агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі здольныя творча пераасэнсаваць багацце нацыянальнай культурнай спадчыны і ажыццявіць новыя адкрыцці ў галіне сучаснай культуры і мастацтва.

## ПОСПЕХІ І ДАСЯГНЕННІ

Сёння на кафедры шчыруюць дванаццаць педагогаў і тры супрацоўнікі вучэбна-дапаможнага персаналу, два педагогі маюць вучоную ступень доктара навук і званне прафесара, чацвёра — ступень кандыдата навук, трое — званне дацэнта. Супрацоўнікі забяспечваюць выкладанне 24 акадэмічных дысцыплін, кіруюць вучэбнай і вытворчай практыкай, акрамя вучэбна-метадычнай вядуць навукова-даследчую, творчую і выхаваўчую работу. Педагогі паспяхова распрацоўваюць тэмы традыцыйных рамёстваў і народнага мастацтва як асновы нацыянальнай мастацкай школы, а таксама ўдзельнічаюць у дзейнасці дзвюх навукова-даследчых лабараторый універсітэта: "Народны касцюм" і "Народныя рамёствы беларусаў".

Кафедра мае пастаянныя базы практык у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук, Нацыянальным гістарычным музеі, Нацыянальным мастацкім музеі. Дзякуючы рабоце калектыву кафедры сёння адраджаюцца і развіваюцца такія віды традыцыйнага мастацтва, як абварная і чорна-глянцаваная кераміка, выцінанка, узорнае ткацтва, маляванка і роспіс па шкле.

Выкладчыкі кафедры прафесар Рыгор Шаўра і дацэнт Тамара Васюк за плённую работу ў галіне навуковай, творчай і педагагічнай дзейнасці адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" адпаведна ў 2000 і 2005 гадах, а дацэнту Людміле Дамнянковай у 2015-м прысуджаная спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Дзеячам культуры і мастацтва".

## ПАДСУМАВАННЕ ПЛЁНУ

Студэнты займаюцца ў профільных майстэрнях керамікі і ганчарства, ткацтва і вышыўкі, габелену, батыку, саломапляцення і роспісу, рэстаўрацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, малюнку, жывапісу, кампазіцыі, скульптуры, колеразнаўства, пластанатоміі. Значнае месца ў рабоце кафедры адводзіцца эксперыментальна-творчай працы педагогаў са студэнтамі. Выставы работ і абарона дыпломных праектаў праходзяць ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры".





За гады існавання кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адбылося 30 выпускаў студэнтаў дзённай формы навучання і 27 — завочнай. Неаднаразова выпускнікі рабіліся стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, а таксама — пераможцамі міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў.



У экспазіцыі, якая працуе з 25 лютага да 15 сакавіка, прадстаўлены работы студэнтаў і выкладчыкаў кафедры, а таксама выпускнікоў розных гадоў. "Спадчыннасць" дэманструе творы, што выкананы ў такіх тэхніках, як кераміка, саломапляценне, ткацтва, батык, валянне, выцінанка і разьба па дрэве.

**Антон РУДАК**
Фота аўтара



На фота:
1. Фрагмент "Мост закаханых у мястэчку Лёзна". Ірына Церашкова.
2. "Глазурная песня". Вольга Сіняўская.
3. "А Вы не з Віцебска?". Ірына Церашкова.
4. "Родная душа". Лізавета Чырвонцава.
5. "Вавёрка". Алена Гурэцкая, Ангеліна Рэкс.